Секцыя 6

# НАРОДНАЯ КУЛЬТУРА І АМАТАРСКАЯ ТВОРЧАСЦЬ У СУЧАСНАЙ САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ ПРАСТОРЫ

***С. Ф. Войцік,***
*дацэнт кафедры беларускай*
*народна-песеннай творчасці,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў*

## ВЫВУЧЭННЕ БЕЛАРУСКАГА ПЕСЕННАГА ФАЛЬКЛОРУ НА ФАКУЛЬТАТЫЎНЫХ ЗАНЯТКАХ У СЯРЭДНЯЙ АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНАЙ ШКОЛЕ

Выхаванне грамадзяніна ва ўмовах пабудовы новай беларускай дзяржаўнасці патрабуе асаблівай увагі да выкладання прадметаў, якія ў рознай ступені ўплываюць на фарміраванне светапогляду маладога пакалення. Этнаграфія і фальклор у гэтым шэрагу займаюць далёка не апошняе месца.

Разуменне новых задач, якія стаяць перад кафедрай беларускай народна-песеннай творчасці, запатрабавала перагляду ўсіх навучальных планаў, увядзення новых прадметаў, развіцця новых творчых напрамкаў і форм працы са студэнтамі. Ужо 20 гадоў разам з кваліфікацыямі «артыст фальклорнага ансамбля», «кіраўнік народнага хору» студэнты атрымліваюць кваліфікацыю «выкладчык фальклору». Першапачаткова кафедра была настроена на шырокія перспектывы развіцця ў гэтым напрамку.

Добрым пачынаннем з боку дзяржавы было стварэнне школ з паглыбленым вывучэннем прадметаў этнамастацкага цыклу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У іх працавалі нашы выпускнікі, якія атрымалі спецыяльную прафесійную музычную падрыхтоўку. Да іх на педагагічную практыку накіроўваліся студэнты, якія на працягу двух гадоў набывалі педагагічныя навыкі і пераймалі вопыт выкладання фальклорных дысцыплін.

На жаль, у апошнія гады гэты вопыт усё радзей запатрабаваны. Ачагі этнаграфічнай і фальклорнай культуры ў агульнаадукацыйнай школе захоўваюцца толькі дзякуючы энтузіязму і адданасці сваёй справе нашых былых выпускнікоў, і, у некаторых выпадках, дзякуючы асабістай увазе і падтрымцы мясцовых кіраўнікоў устаноў адукацыі і культуры. Некаторыя адміністрацыі школ спрабуюць знайсці рашэнне праблем, якія з'явіліся ў сувязі са зменай вучэбных планаў.

Найбольш яркім станоўчам прыкладам з'яўляецца этнамастацкі вопыт агульнаадукацыйнай сярэдняй школы № 3 г. Мінска. Тут эксперымент па стварэнні этнашколы пачаўся яшчэ ў 1996 г. Канцэпцыя, прапанаваная прафесарам Ільёй Іванавічам Сучковым, легла ў аснову працы і паспяхова рэалізуецца настаўнікамі Людмілай Віктараўнай Шпакавай і Таццянай Купрэеўнай Івановай.

Вучні гэтай школы на працягу ўсіх гадоў навучання маюць магчымасць займацца ў класах музычнай і тэатральнай накіраванасці. У аснову працы класаў з тэатральнай накіраванасцю пакладзена вывучэнне фальклорнага тэатра. Фальклорны тэатр – велізарная частка народнай культуры, яго дзейства праходзіць у каляндарныя святы, звязаныя з земляробчым цыклам (Каляды, Масленка, Гуканне вясны, Грамніцы, Вялікдзень, Дажынкі і г. д.), а таксама сямейнымі святамі (Радзіны, Хрэсьбіны, Вяселле і г. д). Знаёмства з гэтым пластом народнай культуры адбываецца паступова, пачынаючы з 1 класа і па 9 клас. Праграма ўключае вывучэнне, падрыхтоўку і пастаноўку народных святаў. Удзел у пастановачным свяце-спектаклі дае ўнікальную магчымасць акунуцца ў свет:

1) гісторыі паходжання таго ці іншага свята;
2) паданняў і міфаў;
3) галоўных дзеючых персанажаў, часцей за ўсё казачных;
4) абрадавых дзеянняў;
5) паэтычнага фальклору;
6) народнай песні;
7) народна-бытавога танца.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Выкладанне асноў народнай культуры ў агульнаадукацыйнай школе можа весціся па-рознаму. Але вопыт школы № 3 г. Мінска па-свойму ўнікальны і варты распаўсюджання ў іншых школах. Удзел дзяцей у народных святах з'ява не выпадковая. У форме гульні, забавы нашы продкі навучалі маладое пакаленне народным традыцыям, перадавалі жыццёвы вопыт, стыль паводзін. Сёння праца нашых выпускнікоў замяняе дзецям народнае настаўніцтва.

Пастаноўка фальклорнага спектакля – гэта асаблівы від творчай працы. Спектаклю папярэднічаюць напісанне сцэнарыя, пошук паэтычных або празаічных тэкстаў, музычнага матэрыялу (песеннага, танцавальнага, інструментальнага), вывучэнне і стварэнне касцюмаў, атрыбутыкі, дэкарацый. Як правіла, пастаноўка фальклорнага спектакля – калектыўная праца, да якой павінны прыцягвацца: сцэнарыст, рэжысёр, хормайстар, пастаноўшчык танцаў, канцэртмайстар, касцюмер, грымёр і інш. Але душой і галоўным арганізатарам свята быў і застаецца яго наладжвальнік, які ў большасці выпадкаў з'яўляецца выпускніком нашай кафедры.

Тым важней для нас тое, з якім духоўным багажом выходзіць са сцен універсітэта наш выпускнік, наколькі ён сам пранікся адчуваннем жывога дачынення да гісторыі і культуры свайго роднага краю, як ён разумее асаблівасці рэгіёну, у якім будзе працаваць. Для сцэнарнага матэрыялу вельмі важна падабраць песні і танцы таго рэгіёну, дзе праходзіць свята. Вядома, для гэтага можна выкарыстаць працу Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук Беларусі (больш за 50 тамоў), дзе, акрамя каштоўнага матэрыялу, у каментарах паказана, калі і ў якім рэгіёне запісаны той ці іншы матэрыял. Але значна важней, калі будучыя пастаноўшчыкі фальклорнага спектакля-абраду самі пабываюць у фальклорнай экспедыцыі, пачуюць і ўбачаць удзельнікаў абраду, пагутараць з імі, зробяць аўдыё і відэазапісы.

Вывучэнне беларускіх народных святаў, звычаяў і абрадаў, іх частковая рэканструкцыя ў выглядзе невялікіх спектакляў з'яўляецца неад'емнай часткай навучальнага працэсу. Вельмі важна выхоўваць у нашых студэнтаў густ, пачуццё стылю, цягу да тэатральна-гульнявой дзейнасці, якая, па сутнасці, з'яўляецца асновай іх будучай прафесіі. У значнай меры гэтая задача вырашаецца педагогамі кафедры, але нядрэннай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дапамогай нашым студэнтам маглі б быць урокі выкладчыкаў-рэжысёраў у выглядзе адкрытых семінараў або майстар-класаў. Для таго, каб песні, танцы, інструментальнае суправаджэнне былі цікавыя гледачу, матэрыял павінен быць аб'яднаны агульным сэнсам па законах тэатральнай драматургіі. Толькі творчая, сістэматычная, мэтанакіраваная праца ўсяго педагагічнага калектыву дапаможа паспяхова вырашыць галоўную задачу – выхаванне асобы, якая любіць і паважае сваю краіну, свой народ, яго традыцыі і культуру.


*1.* Беларускі фальклор у школе: 1-ы клас : дапам. для настаўніка / І. І. Сучкоў, Ф. І. Таранава, Л. І. Рута, В. В. Куржалава. – Мінск : Нар. асвета, 1996. – 176 с.

*2.* Фольклор – музыка – театр: программы и конспекты занятий для педагогов дополн. образования, работающих с дошкольниками : прогр.-метод. пособие / под ред. С. И. Мерзляковой. – М. : ВЛАДОС, 1999. – 213 с.



***Л. Ф. Голікава,***
*кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў*


## АМАТАРСКАЯ МУЗЫЧНАЯ ТВОРЧАСЦЬ У БЕЛАРУСІ: НА ШЛЯХУ ДА АВАЛОДАННЯ ПРАФЕСІЙНЫМІ ФОРМАМІ МАСТАЦТВА

Станаўленне нацыянальнай свядомасці заўсёды адбываецца адначасова з уздымам інтарэсу да народнай творчасці. Адметным этапам у культурнай прасторы Беларусі пазначаны 20–30-я гг. ХХ ст. Менавіта на гэты перыяд прыпадае росквіт аматарскай «жывой творчасці мас» поруч з шырокім спектрам мастацкіх з'яў, адзначаных рысамі перамен у светапоглядзе і светаадчуванні асобы ў новых, савецкіх гістарычных рэаліях.

З мэтай «ачышчэння» рэвалюцыйнага мастацтва паўсюдна падымаюцца пытанні аб неабходнасці стварэння рабочых факультэтаў «ва ўсіх мастацкіх школах», студый «для рабочай і сялянскай моладзі» [1]. У такім кірунку дзейнічалі розныя культурныя ўстановы і суполкі: таварыствы музычнага і драматычнага мастацтва, аматараў выяўленчага мастацтва і музыкі, Пралетарскі ўніверсітэт у Віцебску, народныя кансерва-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ